**Кодэкс прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў**

Прэамбула

Незалежнасць, справядлівасць, адказнасць — фундаментальныя каштоўнасці, што аб'ядноўваюць журналістаў, якія сваё прафесійнае жыццё прысвяцілі таму, каб беларусы заўсёды мелі магчымасць пачуць і ўбачыць праўду. Разам мы моц незалежнай журналістыкі ва ўмовах ціску і цэнзуры. Мы — голас тых, хто не можа казаць.

Свабода слова і права на доступ да праўдзівай інфармацыі з'яўляюцца ключавымі прынцыпамі дэмакратычнага грамадства. Журналісты адыгрываюць вядучую ролю ў падтрыманні грамадскага дыялогу, забеспячэнні празрыстасці ўлады і ў барацьбе з дэзінфармацыяй.

Кодэкс прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў (далей — Кодэкс) вызначае этычныя і прафесійныя нормы, накіраваныя на абарону правоў грамадзян, павагу чалавечай годнасці, а таксама на развіццё прафесійнай журналістыкі, заснаванай на сумленнасці і справядлівасці.

Нормы Кодэкса прызначаныя дапамагчы журналістам у прыняцці рашэнняў, імі можна кіравацца пры ўзнікненні этычных выклікаў, з якімі журналісты сутыкаюцца ў прафесійнай дзейнасці, асабліва ва ўмовах зачысткі інфармацыйнай прасторы ўнутры Беларусі, прызнання медыя экстрэмісцкімі і крыміналізацыі спажывання кантэнту.

Ніякія нормы Кодэкса не могуць быць падставай для прыцягнення супрацоўнікаў СМІ да крымінальнай, адміністрацыйнай, грамадзянска-прававой, дысцыплінарнай ці іншай адказнасці, за выключэннем адказнасці ў межах сістэмы самарэгулявання СМІ. Кантроль за выкананнем Кодэкса здзяйсняе Рада па медыяэтыцы.

Да Кодэкса можа далучыцца любы журналіст, у тым ліку фрылансер, прадстаўнік новых медыя. У выпадку, калі далучаецца цэлая рэдакцыя, нормы Кодэкса распаўсюджваюцца на ўсіх яе супрацоўнікаў.

Кодэкс не забараняе прытрымлівацца іншых кодэксаў прафесійнай этыкі і правіл, якія могуць вызначаць больш строгія прафесійныя абавязкі.

Кодэкс грунтуецца на аснове правоў і свабод чалавека, замацаваных ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Сусветнай хартыі ААН аб свабодзе прэсы, Дэкларацыі прынцыпаў паводзін журналістаў Міжнароднай федэрацыі журналістаў.

Слова “журналіст” у Кодэксе выкарыстоўваецца ў гендэрна-нейтральным значэнні.

Пад грамадскім інтарэсам разумецца інфармацыя, якая аказвае ці можа аказаць істотны ўплыў на грамадства і на жыццё людзей.

Зачыстка інфармацыйнай прасторы ўнутры Беларусі, прызнанне медыяў экстрэмісцкімі і крыміналізацыя спажывання кантэнту далей у Кодэксе будуць называцца дзейнасцю ў экстрэмальных умовах.

Раздзел 1. Прафесійныя стандарты, на якіх грунтуецца Кодэкс:

Незалежнасць: Журналіст павінен заставацца незалежным ад палітычных партый і працаваць без прамога ціску ці чаканняў з боку спонсараў/донараў.

Дакладнасць інфармацыі: Журналіст абавязаны абапірацца на надзейныя крыніцы інфармацыі і праводзіць праверку сабраных фактаў перад публікацыяй.

Аб’ектыўнасць: Журналіст павінен імкнуцца да прадастаўлення аўдыторыі максімальна поўнай і аб'ектыўнай карціны таго, што адбываецца, пазбягаць неправераных сцвярджэнняў і спекуляцый.

Паўната інфармацыі і баланс меркаванняў: Журналіст павінен прыкласці максімум намаганняў для атрымання інфармацыі з усіх магчымых крыніц, забяспечыць баланс розных меркаванняў па ўзнятых у публікацыі пытаннях. Асаблівую ўвагу варта надаваць кантэксту, які суправаджае падзею.

Адказнасць за распаўсюд інфармацыі: Журналіст нясе адказнасць за дакладнасць інфармацыі, якую ён распаўсюджвае. У выпадку памылкі неабходна неадкладна апублікаваць абвяржэнне, забяспечваючы тым самым права аўдыторыі на дакладную інфармацыю.

Для журналістаў недапушчальны плагіят, свядомае скажэнне фактаў, заведама недакладныя каментары, неабгрунтаваныя абвінавачанні, атрыманне незаконнага ўзнагароджання за распаўсюд альбо адмову ад распаўсюду інфармацыі.

Непрымальнасць дыскрымінацыі: Журналіст павінен устрымлівацца ад распаўсюду любых выказванняў, якія могуць спрыяць дыскрымінацыі людзей па прыкметах расы, полу, узросту, сексуальнай арыентацыі, рэлігійных перакананняў, нацыянальнасці ці іншых характарыстык.

Недапушчальнасць мовы варожасці: Журналіст абавязаны пазбягаць выкарыстання мовы варожасці і агрэсіўнай рыторыкі ў сваіх публікацыях.

Праца журналіста павінна спрыяць дыялогу і разуменню, а не ствараць канфлікты.

Салідарнасць: Журналістам важна выказваць салідарнасць з калегамі, якія пераследуюцца за прафесійную журналісцкую дзейнасць.

Раздзел 2. Агульныя палажэнні

2.1. Прафесійная дзейнасць журналіста несумяшчальная з працай у органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, удзелам у дзейнасці палітычных партый. Прымаючы ўдзел у грамадскай дзейнасці, журналісты павінны пазбягаць канфлікту інтарэсаў ці інфармаваць аўдыторыю пра сувязь з такой дзейнасцю.

2.2. Журналіст не мае права прымаць падарункі, аплочаныя паездкі і адпачынкі, а таксама іншыя паслугі, якія могуць паўплываць на яго незалежнасць. У кожным выпадку журналіст павінен інфармаваць грамадскасць пра любую атрыманую падтрымку такога кшталту.

2.3. Журналіста нельга ў службовым парадку абавязаць выконваць працу, калі яна супярэчыць яго ўласным перакананням ці этычным прынцыпам.

2.4. Журналіст мае права адмовіцца ад падрыхтоўкі рэкламнай інфармацыі.

2.5. Журналіст не павінен прапаноўваць свае матэрыялы іншым СМІ без дазволу рэдакцыі. Калі журналіст-фрылансер прапануе матэрыял адразу некалькім СМІ, ён павінен паведамляць пра гэта прадстаўнікам кожнай наступнай рэдакцыі, да якой звяртаецца.

2.6. Журналіст мае права адмовіцца ад аўтарства і не падпісваць свой матэрыял, калі яго змест быў істотна скажоны пры рэдактуры, мантажы ці іншай перапрацоўцы.

2.7. Плагіят несумяшчальны са званнем журналіста.

2.8. Журналісты ці медыя павінны ўказваць першакрыніцу, калі яны выкарыстоўвалі кантэнт, створаны ці апублікаваны іншым журналістам альбо СМІ. Пры цытаванні матэрыялаў іншага медыя трэба прытрымлівацца правілаў цытавання, вызначаных гэтым медыя.

Падчас працы ў экстрэмальных умовах, калі рэдакцыя забараняе размяшчэнне сваіх матэрыялаў на рэсурсах, прызнаных беларускімі ўладамі “экстрэмісцкімі”, да гэтай просьбы варта прыслухацца.

2.9. Ні асобныя журналісты, ні калектывы СМІ не павінны зводзіць рахункі праз медыя. Падобныя паводзіны наносяць шкоду прэстыжу прафесіі ў цэлым і падрываюць давер грамадства да медыя.

2.10. Журналіст абавязаны абараняць прафесійныя годнасць і прэстыж, дэманстраваць салідарнасць з калегамі, якіх пераследуюць за прафесійную дзейнасць.

Раздзел 3. Прынцыпы публікацыі

3.1 Паважаючы права чалавека на атрыманне дакладнай інфармацыі, журналіст павінен публікаваць дакладную, правераную інфармацыю, прытрымліваючыся прынцыпаў аб'ектыўнасці і балансу меркаванняў.

3.2. Журналіст павінен крытычна ацэньваць свае крыніцы інфармацыі, старанна і пільна правяраць факты, абапірацца як мінімум на дзве крыніцы інфармацыі. Пры адсутнасці магчымасці праверыць дакладнасць і крыніцы апублікаванай інфармацыі журналіст можа публікаваць гэтую інфармацыю, але трэба ўказаць, што яна не да канца пацверджаная.

У экстрэмальных умовах журналіст мае права не называць крыніцу інфармацыі, не згадваць прозвішча героя ці эксперта, не падпісваць публікацыю сваім імем для гарантавання дадатковай бяспекі.

3.3. У інфармацыйных паведамленнях факты павінны быць дакладна адмежаваныя ад меркаванняў.

3.4. Распаўсюд інфармацыі, якая змяшчае неаб'ектыўныя альбо неабгрунтаваныя абвінавачанні, недапушчальны, як і ўтойванне важнай для грамадства інфармацыі, скажэнне фактаў і маніпуляцыя імі.

3.5. Паважаючы разнастайнасць меркаванняў, у канфліктнай сітуацыі журналіст павінен даць магчымасць выказацца розным бакам канфлікту. У выпадку, калі адзін з бакоў не можа адказаць аператыўна ці адмаўляецца ад каментароў, трэба пазначыць гэты факт у матэрыяле.

3.6. Асобе, якая падверглася крытыцы, заўсёды павінна быць дадзеная магчымасць растлумачыць, удакладніць, абвергнуць інфармацыю. Калі такой магчымасці няма альбо асоба адмаўляецца скарыстацца гэтай магчымасцю, пра гэта неабходна паведаміць у той самай публікацыі.

3.7. Падрыхтоўку і напісанне аналітычных матэрыялаў, каментаванне тых ці іншых падзей журналіст павінен давяраць асобам, якія з'яўляюцца экспертамі ў дадзенай сферы і чые кампетэнцыя і досвед не падлягаюць сумневу.

3.8. Асоба, што дае інтэрв'ю альбо каментар, мае права ведаць, у якім СМІ і ў якім кантэксце будуць пададзеная яе словы. У экстрэмальных умовах журналіст абавязаны папярэджваць суразмоўцу пра “экстрэмісцкі” статус СМІ.

3.9. Загалоўкі і падзагалоўкі журналісцкіх матэрыялаў павінны цалкам адпавядаць зместу і не скажаць інфармацыю.

3.10. Характарызаваць людзей у матэрыялах СМІ па расавай прыкмеце, веравызнанні, нацыянальнасці і становішчы, якое займае чалавек, неабходна толькі ў тых выпадках, калі гэта мае істотнае значэнне для правільнага разумення публікацыі.

3.11. Запытваючы інфармацыю, журналіст абавязаны назваць сябе і СМІ, якое ён прадстаўляе, паведаміць суразмоўцу пра тое, што яго словы могуць быць надрукаваныя, за выключэннем выпадкаў, калі вядзецца гаворка пра атрыманне канфідэнцыйнай ці афіцыйна недаступнай інфармацыі.

У экстрэмальных умовах журналіст мае права не прадстаўляцца ад імя рэдакцыі, калі ён звяртаецца ў афіляваныя з рэжымам структуры. Атрыманая такім чынам інфармацыя можа быць апублікаваная з адпаведнай пазнакай. І гэта не будзе лічыцца парушэннем прафесійнай этыкі.

3.12. Журналіст і СМІ абавязаны/не абавязаны ўзгадняць канчатковы варыянт свайго матэрыялу з асобай, якая падала інфармацыю. Гэта дапускаецца толькі пры ўзаемнай згодзе бакоў.

Журналіст і рэдакцыя маюць права не ўлічваць заўвагі суразмоўцы, калі гэта афіцыйная асоба ці палітык, а пададзеная ім інфармацыя мае грамадскі інтарэс.

У той жа час асабліва далікатна трэба абыходзіцца з асабістай і ўразлівай інфармацыяй, апублічванне якой можа нанесці шкоду рэпутацыі, годнасці асобы. Журналіст абавязаны/не абавязаны выканаць просьбу гэтай асобы, калі яна выказала жаданне прагледзець і ўзгадніць матэрыял перад публікацыяй.

Сацыяльныя сеткі:

3.13. Журналіст і рэдакцыя, якія выкарыстоўваюць інфармацыю, фотаздымкі і відэа, размешчаныя ў сацыяльных сетках, абавязаныя правяраць іх дакладнасць і належным чынам указваць крыніцу інфармацыі.

3.14 Журналіст павінен атрымаць дазвол на публічнае выкарыстанне інфармацыі, фотаздымкаў і відэа, размешчаных у прыватных сацыяльных сетках асобы. Гэта не датычыцца публічных асоб, якія распаўсюджваюць грамадска значную інфармацыю альбо выступаюць з публічнымі заявамі.

3.15 Нормы Кодэкса не распаўсюджваюцца на асабістыя сацыяльныя сеткі журналіста, тым не менш пры выказванні свайго меркавання ў публічнай прасторы журналісту рэкамендавана прытрымлівацца палажэнняў Кодэкса.

Штучны інтэлект:

3.16 Матэрыялы, цалкам ці часткова створаныя з дапамогай штучнага інтэлекту, павінны мець адпаведную маркіроўку. Размяшчаць яе рэкамендуецца на бачным месцы, каб не ўводзіць у зман спажыўца інфармацыйнай прадукцыі.

Раздзел 4. Абарона гонару, годнасці і прыватнага жыцця

4.1. Журналіст павінен адрозніваць інфармацыю, якая мае грамадскі інтарэс, ад інфармацыі, што патурае грамадскай цікаўнасці.

4.2. Журналіст не павінен публікаваць інфармацыю пра прыватнае жыццё чалавека без яго згоды, за выключэннем выпадкаў, калі гэтая інфармацыя ўяўляе грамадскі інтарэс і важнасць.

4.3.Журналіст не павінен фатаграфаваць ці здымаць на відэа грамадзян у прыватным асяродку без іх згоды. Не павінны публікавацца здымкі ці выявы людзей у іх паўсядзённым жыцці, калі гэта можа зняважыць ці прынізіць іх.

4.4. У экстрэмальных умовах любыя фота (выявы), паводле якіх можна ідэнтыфікаваць асобу, павінны стаць прадметам асаблівай увагі. На просьбы выдаліць фота ці відэа з мэтаў бяспекі трэба рэагаваць згодай.

Рэдакцыям рэкамендавана рабіць непублічным кантэнт, калі ён можа пагражаць бяспецы ўзгаданых асоб. І калі пра гэта папрасілі самі героі публікацыі.

Судовыя працэсы, надзвычайныя сітуацыі, войны

4.5. Падчас асвятлення судовых працэсаў, няшчасных выпадкаў, ваенных дзеянняў, тэрактаў, прыродных катаклізмаў, надзвычаных сітуацый рэдакцыям варта прытрымлівацца заканадаўства той краіны, дзе працуе СМІ.

4.6. Пры асвятленні судовых працэсаў журналіст павінен прытрымлівацца прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці. Чалавек можа быць прызнаны вінаватым толькі судом пры наяўнасці рашэння альбо прыгавору, які ўступіў у законную сілу. Забараняецца публікаваць асабістыя дадзеныя падазраванага (/абвінавачанага?), па якіх можна было б высветліць яго асобу. У гэтым пытанні рэдакцыям варта прытрымлівацца заканадаўства той краіны, дзе працуе СМІ.

4.7. Да вынясення прысуду і канчатковага завяршэння судовага працэсу не павінна публікавацца інфармацыя, якая можа перашкодзіць разгляду справы.

4.8. Асвятленне ходу следства і судовага працэсу павінна быць аб'ектыўным. На ўсіх стадыях расследавання і судовага разбіральніцтва журналіст павінен імкнуцца да поўнага асвятлення пунктаў гледжання бакоў (у крымінальным працэсе, адпаведна, пазіцыі абвінавачання і пазіцыі абароны).

4.9. Калі судовы працэс абумоўлены палітычнымі матывамі (пад "палітычнымі матывамі" маюцца на ўвазе рэальныя падставы непрымальных у дэмакратычным грамадстве дзеянняў альбо бяздзейнасці праваахоўных і судовых органаў, іншых суб'ектаў уладных паўнамоцтваў, накіраваных на ўмацаванне альбо ўтрыманне ўлады суб'ектамі ўладных паўнамоцтваў, ці недобраахвотнае спыненне альбо змяненне характару чыёй-небудзь публічнай дзейнасці), то гэта неабходна адзначыць у матэрыяле.

4.10. Калі ў інтарэсах грамадскасці імя падазраванага было апублікаванае, а пасля факт злачынства не быў даказаны, журналіст абавязаны неадкладна паведаміць грамадскасці, што гэты чалавек невінаваты.

4.11. Публікацыя імёнаў і фотаздымкаў абвінавачаных службовых асоб ды іншых публічных фігур дапушчальная, калі існуе ўзаемасувязь паміж гэтымі асобамі і злачынствам.

4.12. Журналіст не павінен згадваць у СМІ пра злачынства, здзейсненае раней асобай, якая ўжо была пакаранай за яго. Гэтае правіла не тычыцца выпадкаў яўнага крымінальнага рэцыдыву, а таксама выпадкаў, калі асоба працягвае дзейнасць, звязаную са здзейсненым злачынствам, ці прэтэндуе на атрыманне высокай пасады, а таксама ў іншых выпадках, калі ёсць грамадскі інтарэс для такога згадвання.

4.13. Ахвяры няшчасных выпадкаў ці злачынстваў маюць права на асаблівую абарону іх імёнаў. Выключэнні дапушчальныя, калі гаворка ідзе пра грамадскі інтарэс.

4.14. СМІ павінны пазбягаць ідэнтыфікацыі сваякоў і сяброў падазраваных ці асуджаных асоб без іх згоды. Забараняецца публікаваць асабістыя дадзеныя сведкаў злачыннага дзеяння, паводле якіх можа быць ідэнтыфікаваная асоба, без іх згоды.

4.15 Калі злачынства здзейсненае непаўнагадовымі, не варта публікаваць іх імёны і фотаздымкі, што ідэнтыфікуюць асобу.

4.16. Нельга публікаваць імёны ахвяр сексуальнага гвалту ці дэталі, якія маглі б прывесці да раскрыцця асобы пацярпелых, калі толькі самі ахвяры не патрабуюць гэтага.

4.17. Нельга ідэнтыфікаваць дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, якія сталі ахвярамі ці сведкамі сексуальных злачынстваў.

4.18. Інфармацыя пра сям'ю падсуднага, род яго заняткаў, веравызнанне, нацыянальнасць, расу ці сяброўства ў якіх-небудзь арганізацыях публікуецца толькі ў тым выпадку, калі гэта мае непасрэднае дачыненне да справы.

4.19. Для працы на тэрыторыі шпіталяў ды іншых устаноў аховы здароўя журналісты павінны атрымаць дазвол у адміністрацыі медыцынскай установы.

4.20. Выконваючы права чалавека на прыватнае жыццё і канфідэнцыйнасць, журналісты не павінны публікаваць інфармацыю пра стан здароўя чалавека, лячэнне, прагноз, а таксама іншую інфармацыю пра здароўе без згоды гэтай асобы альбо яе законных прадстаўнікоў. Такая інфармацыя можа быць апублікаваная без згоды сваякоў асобы толькі пры выкананні ўсіх наступных умоў: калі гаворка ідзе пра публічную асобу, калі публікацыя гэтай інфармацыі адпавядае грамадскаму інтарэсу і калі маецца афіцыйнае заключэнне медыцынскай установы.

4.21. Асаблівую асцярожнасць варта праяўляць пры падаванні інфармацыі пра новыя метады лячэння, калі яны яшчэ не поўнасцю апрабаваныя і носяць толькі эксперыментальны характар. Варажба і гараскопы не могуць быць пададзеныя ў медыя як дакладная інфармацыя альбо кіраўніцтва да дзеянняў.

4.22. Пры публікацыі звестак пра самагубствы ці спробы самагубства журналіст павінен з асаблівай асцярожнасцю ўказваць матывы і абставіны

самагубства ці спробы самагубства, каб апублікаваныя звесткі не заахвочвалі суіцыдальныя паводзіны ў грамадстве.

Падчас публікацыі такой інфармацыі неабходна інфармаваць пра існуючыя магчымасці эмацыйна-псіхалагічнай дапамогі і групы самадапамогі.

4.23. Не варта ўказваць спосаб самагубства ці спробы самагубства ў загалоўках (трэйлерах), не публікаваць падрабязнасці спосабу самагубства ці спробы самагубства ў любым кантэнце. Не выкарыстоўваць фотаздымкі ці відэазапісы метадаў самагубства, якія ілюструюць суіцыдальныя паводзіны (напрыклад, пятля, лекі, агнястрэльная зброя і г. д.).

4.24. Недапушчальна паказваць сцэны смерці буйным планам. Крывавыя наступствы войн і катастроф, праявы жорсткасці і гвалту можна апісаць і паказаць толькі ў тым выпадку, калі выкананы баланс паміж дакладнасцю ўзаемаадносін і адчувальнасцю гледача, асабліва сем'і ахвяр і іх блізкія.

## Раздзел 5. Выпраўленне памылак

5.1. Абавязкам СМІ з'яўляецца хуткае і поўнае выпраўленне дапушчаных ім памылак. Выпраўленне істотных фактычных памылак павінна публікавацца неадкладна і на бачным месцы.

5.2. Людзі, у дачыненні да якіх былі распаўсюджаны крытычныя выказванні, павінны мець магчымасць неадкладнага адказу. Гэтыя адказы не варта суправаджаць рэдакцыйнымі палемічнымі каментарамі, яны павінны мець разумны аб'ём, адпавядаць сутнасці пытання і быць прымальнымі па форме.